Хору духовной музыки “Бацькаўшчына” в 2007 году исполнилось 15 лет. В статье представлены основные этапы его становления и вклад в развитие белорусской культуры.

Summary

To chorus of sacred music “Batskauschyna” in 2007 15 years were executed. In article the basic stages of his becoming and the contribution to development of the Byelorussian culture are submitted.

УДК 502.12 (476.6)

## ЭКАЛАГІЧНЫ РУХ НА ГРОДЗЕНШЧЫНЕ Ў КАНЦЫ XX – ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

**М.І. Таранда**

УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт”

г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Толькі год таму ГДАУ адзначыў свае 55 угодкі. Яго выпускнікі, спецыялісты, непасрэдна звязаныя з працай у сельскай гаспадарцы, як ніхто іншы аказвалі ўплыў на экалагічны стан нашай рэспублікі ў другой палове XX стагоддзя. Асвойваліся новыя тэрыторыі, асушваліся забалочаныя прасторы, зямная паверхня і воды забруджваліся адыходамі калійнай вытворчасці ў Салігорску. Так званыя “лісіныя хвасты” яшчэ ў 80-тыя годы упрыгожвалі трубы ГВА “Азот”. Чарговы праліў нафты з нафтапроваду ў Бешанковіцкім раёне ў сакавіку 2007 года прывёў да забруджання басейну Дзвіны.

Вядома, што кадры для сельскай гаспадаркі Беларусі ў міжваенным перыядзе рыхтаваліся на аграрным факультэце Віленскага універсітэта. Узначальваў сельскагаспадарчы факультэт Станіслаў Пачобут-Адляніцкі, які паходзіў з Гродзеншчыны. Сярод студэнтаў былі Бернанд Стэповіч, Ганна Сухая і іншыя. Пасля вайны сельскагаспадарчы факультэт Віленскага універсітэту пераехаў у Познань. З цягам часу С. Пачобут-Адляніцкі стаў дырэктарам станцыі ільна, якая пазней пераўтварылася ў Інстытут натуральнага валакна. Між іншым Б. Стэповіч пісаў дыпломную працу таксама па ільну, а ў сям’і захаваўся альбом са студэнцкіх практык. Тэмамі для дыпломных былі надоі кароў, папуляцыі зайцоў у Налібокскай пушчы і іншыя.

У 1986 годзе аўтар працаваў у Інстытуце біяхіміі АН Беларусі ў Гродна. Не ведаючы ў якім баку той Чарнобыль, пасля аварыі было заўважана , што запрацавалі нават тыя прыборы, у якіх заўсёды загаралася толькі зялёнае святло, якое паказвала, што пасля працы з радыяктыўнымі ізатопамі рукі даследчыка чыстыя ад радыяцыі. У той



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

дзень, як і ў наступныя, радыяактыўны фон з нашага абутку запальваў толькі чырвонае святло. Набліжаліся першамайскія святы, краіна рыхтавалася да традыцыйных дэманстрацый і толькі акадэмік Юрый Міхайлавіч Астроўскі, дырэктар Інстытута біяхіміі АН БССР, звярнуўся да гарадскіх уладаў з просьбай змываць радыяцыю з дамоў і вуліц вадою і адмяніць першамайскую дэманстрацыю ў Гродна. Яго ніхто не паслухаў.

Каля двух месяцаў раней інтэлігенцыяй горада Гродна быў створаны клуб аматараў гісторыі і культуры роднага краю, які затым атрымаў назву "Паходня". Планавалася вывучэнне гісторыі і культуры, але ўжо на самым пачатку дзейнасці сябры клуба выступілі ў ахову гістарычных помнікаў, якія рушыліся ўладамі. Не паспелі заўважыць, як прымкнулі і да вырашэння экалагічных праблем.

Са старажытных часоў даліна Гараднічанкі служыла натуральнымі лёгкімі горада. Забруджанае паветра, гарадскі смог спускаліся да рэчкі і ўздоўж яе выдаляліся да Нёмана і за межы горада. Там, дзе зараз плошча Леніна, цякла Гараднічанка, у даліне якой было шмат крыніц, якія планавалася пераўтварыць у комплекс з двух дзесяткаў фантанаў. Але камусці стукнула ў галаву ідэя засыпаць прыгожую даліну, ад якой засталіся толькі некалькі бярозак ля гарвыканкама. Рабілася гэта на вачах гаражан і ніхто ні слова не сказаў супраць такога праекта. Астаткі Швейцарскай даліны знаходзіліся ў жахлівым стане. Гэта быў склад гарадскога смецця за многія гады з бочкамі фарбы ды мазуту. Летам 1987 года сябрамі клубу былі праведзены тры суботнікі і Гараднічанка набыла новы, больш прывабны выгляд. Праз гарадскі камітэт камсамола мы даставалі транспарт для вывазу смецца. А ад гаркама партыі атрымалі заўвагу, што не мелі права ствараць аргкамітэт, якія з'яўляліся тады толькі прэрэгатывай партыі камуністаў.

Агульным клопатаў для арганізацый моладзі Беларусі ў 1987г. стала барацьба з будаўніцтвам гідраэлектрастанцыі ў Латышскім горадзе Даўгаўпілсе. Для тэрыторыі рэспублікі гэта быў бы другі Чарнобыль, паколькі пад вадою аказаліся б 87 населеных пунктаў, адбылося забалочанне вялікіх абшараў сельскагаспадарчых угоддзяў. Сабраныя подпісы ў адрас Савета Міністраў СССР, воднае раллі па Дзвіне на плытах, чаўнах і байдарках разам з прадстаўнікамі латышскіх арганізацый, у якім прыняла ўдзел і дэлегацыя ад Гродна, прадстаўленая студэнтамі медыцынскага інстытута, змаглі спыніць будаўніцтва ГЭС. Апошнія рабочыя будаўнічай пляцоўкі электрастанцыі з'ехалі ў 1989 годзе. І зараз, калі Літва вырашыла пабудаваць ядзерны могільнік у зоне блізкай як да экалагічна чыстых



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

раёнаў Беларусі, так і ў 30 км ад Даўгаўпілса, ў бок якога пастаянна дзьмуць вятры, супраць будаўніцтва могільніка выступаюць грамадскія арганізацыі Латвіі, якія немалыя надзеі ўскладваюць і на падтрымку з боку Беларусі. На ўзроўні кіраўніцтва рэспублікі зроблены заявы аб тым, што калі будзе пабудаваны могільнік, то на тэрыторыі Беларусі, ля мяжы з Літвою, будуць пабудаваны два вялікія свінакомплексы.

Ужо ў тыя гады былі бачны недахопы асушэння палескіх балот. Тарфянікі хутка мінералізаваліся, глеба бяднела, ператваралася ў пяскі, ад якіх нярэдка здараліся пыльныя буры. Але асушэнне працягвалася, а пасля чарговых разводдзяў Прыпяць пачалі абвалоўваць. Раллі суполак моладзі па Прыпяці ў 1988 годзе было накіравана супраць асушэння Палесся. І асушэнне было спынена, хутчэй магчыма таму, што пачаўся эканамічны крызіс.

У тым жа годзе на імя М.С.Гарбачова і Вярхоўнага Савета СССР быў накіраваны ліст аб тым, што кіраўніцтва БССР недастаткова робіць для ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай аварыі. Ад Гродна ліст падпісалі чатыры чалавекі, у тым ліку і аўтар гэтага артыкула. Сакратар ЦК КПСС накіраў ліст назад у рэспубліку і ў выніку адбылася шасцігадзінная размова ў ЦК КПБ усіх падпісантаў з сакратаром ЦК КПБ Я.Сакаловым і Старшынёй Вярхоўнага Савета БССР Г. Таразевічам.

Вельмі важным у гады перабудовы было набыццё рэспублікай статуса без’ядзернай краіны. На тэрыторыі Беларусі, як нідзе болей, былі сканцэнтраваны стратэгічныя ядзерные ракеты, якія ў выніку ваеннага канфлікту выклікалі б адэкватны ядзерны ўдар з боку Захаду. Таму беларускімі суполкамі моладзі была арганізавана вандроўка па тэрыторыям ракетных баз размешчаным на тэрыторыі Дзятлаўскага і Лідскага раёнаў. Гэта быў травень 1990 года. Беларусь яшчэ была ў складзе СССР. Праз некалькі гадоў усе ядзерныя ракеты былі выведзены з тэрыторыі Беларусі.

1987 год не прадвяшчаў распаду СССР. Яшчэ былі сродкі на пашырэнне магутнасцей Гродненскіх вытворчых аб’яднанняў “Азот” і “Хімвалакно” і на будаўніцтва біяхімзавода ў Скідэлі. Але грамадскасць Гродна ўжо паспела для таго, каб захаваць яго чысціню. Былі вызначаны памеры шкоды, якія наносіліся навакольнаму асяроддзю, асабліва на ўсход ад “Азота”, пачалося адсяленне людзей з бліжэй размешчаных вёсак. Да гэтага часу невядома, хто быў ініцыятарам стыхійнай дэманстрацыі ў Гродна, якая пачыналася каля палаца хімікаў, магчыма, работнікі абутковай фабрыкі. Да калоны далучаліся людзі ў раёне Савецкай плошчы і ля новага помніка Леніну распачаўся мітынг супраць пашырэння хімічных прадпрыемстваў.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Аўтар тады выступаў першым, паколькі быў пад ураджаннем зімовай паездкі ў Новаполацак, прыгожы сучасны горад, з шырачэннымі вуліцамі, у якім проста не было чым дыхаць. Марознае паветра не было чыстым, яно мела пах пластмасы. Выступаючых было шмат. Усе прапановы былі ўключаны ў рэзалюцыю, якую павінна была даставіць на паседжанне аблвыканкама дэлегацыя, абраная на мітынгу. Раніцай у дзень паседжання аблвыканкама падтрымаць дэлегацыю прыйшло шмат людзей.

Ужо пасля 1990 года старшыня Гродзенскага аблвыканкама Д. Арцымня вырашыў пабудаваць завод па вырабу ўплатняльнікаў для ваконных рам у раёне вуліцы Карскага.. Сябры "Паходні", якія працавалі ў "Грамадзянпраекце" здабылі праектную дакументацыю на гэты завод. Аказалася, што вытворчасць гэта магла аказацца вельмі небяспечнай для горада. Прадукцыя пралітая на зямлю павінна была вывозіцца і захоўвацца ў спецыяльных могільніках. У выніку пажару магло б утварыцца столькі сінільнай кіслаты, што яе было б дастаткова для гібелі жыхароў Азёрскай шашы і вуліцы Пралетарская. Матэрыялы былі перададзены на Гродзенскае тэлебачанне, якое звярнулася да мяне з просьбай пракаменціраваць сітуацыю з заводам. Теэлезапіс быў зроблены з тэрыторыі будаўнічай пляцоўкі завода. Шкодны для экалогіі горада завод не быў пабудаваны.

У 1999 годзе пры Гродзенскім дзяржаўным аграрным універсітэце была створана рэспубліканская грамадская асацыяцыя "ЗемЭко" (земляробства экалагічнае), якая ў 2000 годзе была прынята ў склад міжнароднай асацыяцыі арганічнага земляробства (IFOFM), што дазволіла вучоным і практыкам удзельнічаць у семінарах, канферэнцыях, сімпозіумах па абмену вопытам. Гродзенскі аграрны ўніверсітэт стаў цэнтрам экалагічнага земляробства ў рэспубліцы. Грамадскае аб'яднанне ў 2001 годзе распрацавала метадычныя рэкамендацыі "Правила и нормы экологического земледелия для условий Республики Беларусь".

У 2003 годзе прадстаўнікамі нямецкай фірмы BCS у РБ былі сертыфіцыраваны тры сельскагаспадарчыя прадпрыемствы:

- фермерская гаспадарка "Твін",
- прыватная садавінная гаспадарка Трамбовіча Гродзенскага раёна,
- сельскагаспадарчы кааператыў імя Леніна Лунінецкага раёна.

Але, з-за адсутнасці попыту, экалагічна чыстая прадукцыя была рэалізавана, як звычайная, акрамя сталовых буракоў, якія былі выкарыстаны для атрымання прадуктаў дзіцячага харчавання.

Значная доля сельскагаспадарчай прадукцыі ў Беларусі атрымліваецца ў прыватных гаспадарках сялян, у якіх прымяненне



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

сродкаў хіміі нязначнае. Таму пэўную частку прадукцыі іх варта было б кваліфіцыраваць як "экалагічна чыстую". Калі за мяжой прымяняецца каля 35 апрацовак садоў за год хімічнымі сродкамі, то ў Беларусі, у прыватным сектары, такія апрацоўкі садавіны не прымяняюцца ўвогуле. Сябрамі ўжо былой асацыяцыі "ЗемЭко" (юрыдычны статус яе зараз страчаны) у 2006 годзе выдадзены "Практические рекомендации по ведению экологически чистого сельского хозяйства в РБ», распрацаваныя ў рамках падтрымкі РБ урадам ФРГ, якія ўтрымліваюць каштоўныя парады для спецыялістаў аграрыяў па атрыманню экалагічна чыстай прадукцыі.

Яшчэ адной важнай экалагічнай арганізацыяй Гродзеншчыны з'яўлялася "Заходне-беларускае таварыства аховы птушак"(ЗБТАП), якое было заснавана ў 1993-1994 г.г. арнітолагамі і аматарамі птушак Гродзенскай і Брэсцкай абласцей. За 1993-1999 годы ЗБТАП здзейсніла некалькі праектаў, звязаных, у асноўным, з вывучэньнем і аховай драпежных птушак. Таварыства налічвала каля 100 сябраў, але не прайшло чарговую перарэгістрацыю ў 2000 годзе. У 1998 годзе на базе ЗБТАП і Беларускага арніталагічнага таварыства была створана новая грамадская арганізацыя "Ахова птушак Беларусі", пасля апошняй перарэгістрацыі "Ахова птушак Бацькаўшчыны" (АПБ), якая зараз налічвае больш за 1800 сябраў і мае 10 рэгіянальных аддзяленняў. АПБ праводзіць маніторынг знікаючых відаў, тэрыторый, важных для птушак. З другога боку праводзіць экалагічную адукацыю праз выданне кніг і фотаальбомаў аб прыродзе Беларусі, інфармацыйных бюлетэней, навукова-папулярнага часопіса "Птушкі і мы" і навуковага часопіса "Subbuteo". Акрамя таго, праводзяцца сусветныя дні назірання за птушкамі, зімовыя ўлікі птушак, летнікі для старшакласнікаў, студэнтаў і настаўнікаў, фотаконкурс "Птушка ў аб'ектыве", чэмпіянат па спартыўнай арніталогіі, штогадовыя навукова-папулярныя канферэнцыі і абласная заалагічная канферэнцыя школьнікаў.

З 2005 года пры ГА "Белая Русь" існуе экалагічная суполка "Прынямонне", сябрамі якой з'яўляюцца ў асноўным студэнты факультэта ветэрынарнай медыцыны ГДАУ, якія арганізуюць экалагічныя азнаямляльныя паездкі, здымаюць фільмы і праводзяць конкурсы фотаздымкаў аб прыродзе.

Усё больш разгортваецца наша супрацоўніцтва з экалагічнымі, культурнымі, турыстычнымі арганізацыямі суседніх краін, асабліва Польшчы ў межах агульнага праекту "Зялёныя лёгкія Еўропы", у якім рэгіёну, прылягаючаму да Балтыйскага мора, адводзіцца важнае месца. Улічваючы ружу вятроў можна зрабіць вывад, што намаганні Германіі,



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

паўночнай часткі Польшчы, Калінінградскай вобласці і Літвы будуць скіраваныя на чысціню паветра менавіта над тэрыторыяй Беларусі.

Літаратура

1. Дэмакратычная апазыцыя Беларусі:1956-1991/Даведнік. – Мн.:АНГ, 1999. – 186 с.
2. Практические рекомендации по ведению экологически чистого сельского хозяйства. в РБ. – Минск-Гродно-Вилейка, 2006. – 296 с.
3. Сайт АПБ: www.ptushki.org
4. Таранда М. Трэці сэктар. 2002, № 26. – С.14-15; № 27. – С.22-23; 2003, № 28. – С.14; № 29. – С9-10; № 30. – С.15-18; 2004, № 31. – С.17-20; № 32. – С.17-19; № 33. – С.19-21; № 34. – С.21-24; № 36. – С.14-19; 2006, № 37. – С.36-43;

Резюме

В статье прослеживается возникновение общественных организаций в конце XX столетия в Гродно и их роль в решении экологических проблем.

Summary

In article occurrence of public organizations is traced at the end of XX century in Grodno and their role in the decision of environmental problems.

УДК 101.1:316

# ИСТОРИЧЕСКИЙ ОПЫТ КАК ФАКТОР ФОРМИРОВАНИЯ И РЕАЛИЗАЦИИ СОЦИАЛЬНОГО ВЫБОРА (НЕКОТОРЫЕ АСПЕКТЫ ПРОБЛЕМЫ)

**Д.А. Трафимович**
УО «Гродненский государственный университет имени Я.Купалы»
г. Гродно, Республика Беларусь

Механизм выбора обществом того или иного варианта своего исторического пути неизбежно включает в себя процедуру анализа и использования социально-исторического опыта. Опыта не только и не столько собственного – приобретенного всем обществом или его значимыми социальными слоями в ходе разного рода исторических коллизий, но и траслированного иными социальными системами, т.е. заимствованного, возникшего таким же образом у других народов, но «взятого напрокат» [1, С. 174].

Это означает, что в процессе принятия решения активный социальный субъект обращается либо к предыдущим состояниям собственной системы, либо к иным истемам, уже реализовавшим иные



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ